# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Цэгла. Ткач. Скат. Калёсы. Свіран. Канва. Аер. Сонца. Бура. Рэпа. Кеды. Зубр. Каланча. Верш. Тын. Арктыка. **Па вертыкалі:** Гуслі. Асака. Капё. Чары. Кастрычнік. Танкіст. Сівец. Нанду. Арала. База. Рабчык. Рыкша. Егер. Унты. Рана. Лак.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.36 | 19.50 | 13.14 |
| Віцебск — | 6.25 | 19.41 | 13.16 |
| Магілёў — | 6.27 | 19.40 | 13.13 |
| Гомель — | 6.25 | 19.35 | 13.10 |
| Гродна — | 6.52 | 20.05 | 13.13 |
| Брэст — | 6.55 | 20.03 | 13.08 |

## Месяц

*Апошняя квадра 2 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

***Пр.** Кірыла, Фамы, Фёдара, Якава.*
***К.** Ірэны, Рэнаты, Антона, Панкрата, Рыхарда.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




## 3 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1921** год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Валынец, жывапісец, майстар пейзажа, адзін з найлепшых партрэтыстаў Беларусі, стваральнік галерэі партрэтаў Герояў Савецкага Саюза, вядомых дзеячаў культуры, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, сямю медалямі.

**1941** год — нарадзіўся (в. Рачкавічы Слуцкага раёна) Анатоль Іванавіч Леснікові́ч, вучоны-фізікахімік, акадэмік НАН Беларусі, вынаходнік СССР, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1944** год — пачаліся баі партызанскіх брыгад імя Дзяржынскага, «Савецкая Беларусь» і 345-га партызанская атрада супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай Здзітаўская абарона. Боесутыкненні партызан і гітлераўцаў каля вёскі Здзітава ў Бярозаўскім раёне працягваліся да 11 красавіка. За час баёў вораг страціў забітымі і паранenымі звыш 600 салдат і афіцэраў, вялікую колькасць тэхнікі і зброі. На сем сутак была поўнасцю затрымана перагрупоўка войскаў праціўніка па дарозе Драгічын — Бронная Гара. На месцы баёў у Здзітаве ў 1975 годзе адкрыты мемарыяльны комплекс. Ён унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.



**1954** год — нарадзіўся Юрый Аляксеевіч Пудышаў, вядомы беларускі спартсмен і трэнер, чэмпіён Савецкага Саюза па футболе 1982 года ў складзе мінскага «Дынама». 25 кастрычніка 2010 года ўстанавіў рэкорд чэмпіянатаў Беларусі (калі выйшаў на поле ва ўзросце 52 гадоў) на 90-й хвіліне ў матчы БАТЭ — «Дынама» (Брэст).




**1879** год — Сафія абвешчана сталіцай Балгарыі. Горад быў заснаваны сем тысяч гадоў таму і з'яўляецца другім найстарэйшым горадам Еўропы. Сафія размешчана на адным з самых старажытных і ажыўленых скрыжаванняў Еўропы, якое злучае Захад з Усходам.



**1885** год — нямецкі вынаходнік Готліб Даймлер атрымаў патэнт на свой першы рухавік — у палову конскай сілы.

**1922** год — на пленуме ЦК РКП(б) Іосіф Сталін выбраны генеральным сакратаром ЦК партыі. Першапачаткова гэтая пасада азначала толькі кіраўніцтва апаратам партыі, а ў якасці лідара партыі і ўрада ўсімі працягваў успрымацца старшыня СНК РСФСР Уладзімір Ленін.

**1973** год — гэты дзень прынята лічыць днём нараджэння штрыхавога кода (штрых-кода) — аднаго з самых перадавых і карысных вынаходстваў XX стагоддзя, якое паклала пачатак аўтаматызацыі працэсу ўліку і водпуску тавараў.




**П'ЕР БУАСТ:**

*«Асвета і патрыятызм ствараюць нацыі, невуцтва і эгаізм ствараюць чэрнь».*



*Шаноўную **Алену Леанідаўну ЛЯЎКОВІЧ**, першага намесніка дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», прыгажуню, разумніцу, аўтарку цудоўных вершаў і любімых чытачамі «...суб'ектываў», шчыра віншуем з прыгожай круглай датай! Зычым моцнага здароўя, новых творчых поспехаў, бадзёрасці, аптымізму, цярпення... Дзякуем за ўсё, што вы робіце для краіны, газеты, для сяброў па «цэху».*

**Звяздоўцы.**

*З шасцідзесяцігоддзем шчыра віншуем загадчыка адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» **Алега Мікалаевіча БРАШКО**.*

*Зычым добрага здароўя, поспехаў*
*у працы, шчасця ў асабістым*
*жыцці:*
*Каб зоркі падалі ў руку,*
*Каб вам —*
*ва ўсім —*
*спрыяла неба!*
*І каб хапала ў кашальку*
*На ўсе надзённыя патрэбы.*



**Звяздоўцы.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.695. Індэкс 63850. Зак. № 886.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12